М.А.Бяспалая, *прафесар*

# УДАСКАНАЛЕННЕ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ВА ЎМОВАХ ШМАТУЗРОЎНЕВАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

Сучасны стан навукі, пашырэнне новых метадалагічных падыходаў патрабуюць пастаяннай працы над удасканаленнем арганізацыі вучэбнага працэсу і методык данясення зместу



БИБЛИОТЕКА БГУКИ

навучання да студэнтаў. Безумоўна, канстантай гэтага павінна заставацца думка аб галоўнай задачы, накіраванай на выхаванне такой адукацыйнай культуры і атрыманне такога ўзроўню адукаванасці, якія ўласцівы толькі вышэйшай школе. Даўно вядома, што стаць прафесіяналам можна, пастаянна паглыбляючы свае веды.

Адной з важнейшых частак адукацыйнай культуры студэнтаў, наогул кожнага спецыяліста, з'яўляюцца імкненне і здольнасць да самастойнай работы. Бясспрэчна, адносіны да яе, змест самастойнай работы не могуць ды і не павінны быць аднолькавымі на розных ступенях падрыхтоўкі. Гэта перш за ўсё вынік правільна арганізаванага вучэбнага працэсу, які прадугледжвае рашэнне як арганізацыйных задач, так і метадычнага забеспячэння навучання. Можна сказаць, што ва універсітэце культуры гэтыя накірункі самастойнай работы вырашаны: на ўзроўні дэканатаў — расклад заняткаў, выдзяленне аднаго дня ў тыдзень на самастойную работу; на ўзроўні кафедраў — стварэнне рабочых вучэбных праграм, метадычных распрацовак і комплексаў, распрацоўка сістэмы ацэнак вынікаў самастойнай работы студэнтаў. На наш погляд, гэта свайго роду тэхналагічны падмурак арганізацыі самастойнай работы.

Больш складаны і адказны працэс пачынаецца з фарміравання ў студэнтаў навыкаў самастойнай вучэбнай дзейнасці. У некаторай ступені выпускнікі сярэдняй школы маюць уяўленне аб самастойнай рабоце. Праўда, у большасці яно зводзіцца да напісання рэфератаў, што пры наяўнасці камп'ютэрнай тэхнікі не так і складана. Але, на жаль, толькі некаторыя з учарашніх школьнікаў у поўнай меры разумеюць неабходнасць самастойнай работы. Многія першакурснікі доўга не могуць прызвычаіцца да вучэбнай сістэмы вышэйшых навучальных устаноў. Таму задача фарміравання навыкаў самастойнай работы з'яўляецца галоўнай для выкладчыкаў

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

прадметаў сацыяльна-гуманітарнага цыкла, якія вывучаюцца на першым — другім курсах.

Безумоўна, вялікая роля ў вырашэнні гэтай задачы належыць лекцыям. Уменню слухаць, правільна канспектаваць, праводзіць аналогіі, класіфікаваць матэрыял павінен вучыцца першакурснік. Падобнымі да школьных урокаў у ВНУ з'яўляюцца семінарскія заняткі. У большасці выпадкаў яны звязаны з пераказам вывучаемага матэрыялу, першакрыніц, аналізам праблемных пытанняў. Відавочна, што з гэтым вельмі цесна звязана такая ўмова ўдасканалення самастойнай работы, як якасць выкладання. Не выпадкова пры анкетаванні на першае месца студэнты ставяць асобу выкладчыка і якасць выкладання. Гэтая акалічнасць з'яўляецца стымулам актывізацыі і ўдасканалення самастойнай работы; яе значэнне і роля ўзрастаюць на старшых курсах, калі пачынаецца выкладанне цыклаў тэарэтычных і практычных спецыяльных дысцыплін.

Асабліва адзначанае важна для універсітэта культуры. Справа ў тым, што апошнім часам рэзка ўзрастае роля духоўнай культуры ў развіцці чалавецтва. Грамадства імкліва мяняецца і абнаўляецца. Удзельнічаць у працэсе вывучэння гэтых з'яў, даносіць сваё разуменне іх да студэнтаў, абуджаць думку навучэнцаў, накіроўваць яе на самастойны аналіз — абавязак кожнага выкладчыка. Улічваючы сказанае вышэй, мы не можам будаваць сваю дзейнасць без распрацовак праблемных лекцый на сучаснай аснове, без супастаўлення пазіцый розных навуковых школ, без пошуку аптымальных, на наш погляд, шляхоў развіцця культуры, яе месца ў грамадстве.

Удасканаленне самастойнай работы студэнтаў у значнай ступені залежыць ад наяўнасці вучэбнай літаратуры. Адышлі ў нябыт падручнікі, якія толькі пераказваюць матэрыял, як і перапіска тэкстаў у якасці аднаго з відаў самастойнай падрыхтоўкі. У навейшых падручніках гісторыі, культуралогіі,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

псіхалогіі, педагогікі, практычных дапаможніках (у асноўным расійскіх) уводзіцца шмат новага: тэзаўрусы — спісы спецыяльных тэрмінаў, даюцца праграма курса, заданні для калёквіумаў, тэмы дакладаў, вытрымкі з крыніц, тэсты, якія прадугледжваюць некалькі адказаў. Вельмі цікавымі ў сэнсе арганізацыі самастойнай работы і яе праверкі выступаюць апорныя метадычныя матэрыялы, а таксама прадуманыя для кожнай тэмы абавязковыя і дадатковыя спісы літаратуры.

Трэба адзначыць пэўныя дасягненні ў гэтым накірунку ў БДУ культуры. Прыкладам можа быць цікавая работа дацэнта В.А.Грачовай па беларускай і сусветнай мастацкай культуры. Плануецца выпуск сучасных дапаможнікаў на кафедрах псіхалогіі і педагогікі, філасофіі, бібліятэказнаўства і інш.

Не могуць быць аднолькавымі формы самастойнай работы і кантролю за іх выкананнем у першакурснікаў і на старшых курсах. Калі на першым і другім курсах ужываюцца бліц-апытанне, карткі-заданні, семінары-дыспуты, экспрэс-канферэнцыі, заданні адной студэнцкай групы другой, то для старшых курсаў гэтыя формы не характэрныя. Названыя формы грунтуюцца ў асноўным на атрыманых ведах студэнтаў, задача ж выкладчыкаў — іх пашырыць і актуалізаваць.

На нашу думку, значная роля ў самастойнай творчай рабоце пры вывучэнні праблемных пытанняў належыць калёквіумам. Каб падрыхтаваць тэму калёквіума, студэнт павінен самастойна прааналізаваць значны аб'ём навуковай літаратуры, абдумаць складаныя пазнавальныя заданні. Падчас калёквіумаў можна выкарыстоўваць методыку навуковых дакладаў, дзелавых гульняў з удзелам дзвюх рабочых груп, а таксама заданні па групах з падрыхтоўкай па методыцы навуковых пілотных праектаў. Апошнія прадугледжваюць пастаноўку праблемы, фармуляванне агульных палажэнняў, групавую распрацоўку асобных пытанняў, аўтаномных па выкарыстаным матэрыяле, абарону атрыманых вынікаў і іх “пілатаванне” —



БИБЛИОТЕКА БГУКИ

распаўсюджванне ў астатніх групах у якасці асновы для падвядзення вынікаў і калектыўнага аналізу. Такая работа грунтуецца на псіхалагічнай заканамернасці, згодна з якой творчая індывідуальнасць выяўляецца толькі "праз другога" і "разам з другім", актыўнае мысленне ўзнікае толькі ў працэсе дыялога, ва ўмовах сумеснай дзейнасці двух ці больш чалавек. Яно рэалізуецца галоўным чынам у праблемнай сітуацыі.

Шматузроўневая падрыхтоўка спецыялістаў ва універсітэце прадугледжвае такую ступень, як бакалаўрыят. Самастойная работа бакалаўра павінна садзейнічаць паглыбленню мыслення, дапамагчы будучаму спецыялісту хутка адаптавацца да канкрэтнай прафесійнай дзейнасці. Дасягнуць гэтага можна, на наш погляд, праз пераход да міжпрадметнага і цыклавага навучання. Пад першым мы разумеем выкладанне інтэграцыйных курсаў, якія абапіраюцца на папярэднія веды студэнтаў і на іх аснове раскрываюць шырокі спектр новых метадалагічных падыходаў і сучасных навуковых дасягненняў. Прыкладам можа стаць курс "Гісторыя і культуралогія", які чытаецца ў ВНУ Расіі (першы вопыт ужо адзначаны Міністэрствам адукацыі Расійскай Федэрацыі), ці курс "Сацыяльная культуралогія" або "Культурна-гістарычная псіхалогія". У якасці другога шляху можна прапанаваць выкладанне цыклаў дысцыплін, якія аб'яднаны адзінай метадалогіяй ці храналогіяй, напрыклад комплексны курс "Еўропа ў сярэднявеччы" з выкладаннем спецкурсаў па гісторыі, літаратуры, педагогіцы, мастацтве вызначанага перыяду з абавязковай ацэнкай. І ў першым, і ў другім выпадку ад бакалаўраў патрабуецца актыўная інтэлектуальная работа па засваенні такіх курсаў і фарміраванні фундаментальных тэарэтычных ведаў у кантэксце праблем, задач, сітуацый, мадэліруемых на аснове культуралагічных дысцыплін.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Мы не павінны выпускаць з-пад увагі і той факт, што даклад ці рэферат па праблемным пытанні, курсавая і дыпломная работы фарміруюць навуковыя якасці, будучы навуковы патэнцыял універсітэта. Пастаноўка праблемы, супастаўленне і аналіз розных пунктаў гледжання, пошук адказу на іх — гэта фактары, якія грунтуюцца на здольнасці студэнта, на яго ўнутраным жаданні паглыбляць свае веды. Правілам павінны стаць скразныя навукова-даследчыя работы ад курсавой да кандыдацкай у рэчышчы комплексных навукова-даследчых тэм кафедры.

Такім чынам, праблемнасць выкладання і навучання, далучэнне студэнтаў праз самастойную работу да апошніх навуковых дасягненняў, пошукі новых формаў стымулявання самастойнай інтэлектуальнай творчасці, удасканаленне зместу самастойнай работы студэнтаў, прывядзенне яе ў адпаведнасць з рознымі ступенямі навучання з'яўляюцца галоўнымі ўмовамі якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, узрастання цікавасці студэнтаў да будучай прафесіі.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ